УДК 321.013:314.151.3.(091) «1920»(=161.3)

А. А. Райчонак, ст. выкладчык

# ПАДЫХОДЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ БЕЛАРУСКАГА ЗАМЕЖЖА ДА ПЫТАННЯ АБ УВАСАБЛЕННІ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ Ў СЯРЭДЗІНЕ 20-Х ГГ. XX СТ.

The article examines some questions related to the views of various Belarusian emigrant groups of problems of the further development of Belarusian statehood. Their political orientation to different states on purpose to realize their own interests is analyzed. Besides the activities of the USSR and BSSR leaders aimed at destruction of organization structures of Belarusian People's Republic abroad, their objectives and tactics on this issue is focused on.

**Уводзіны.** Пад тэрмінам «прадстаўнікі беларускага замежжа» разумеюцца ўсе тыя дзеячы беларускага нацыянальнага руху, якія па волі лёсу апынуліся па-за межамі БССР. Да гэтай групы неабходна аднесці прадстаўнікоў Заходняй Беларусі, беларускую дыяспару ў Літве, а таксама беларускую палітычную эміграцыю, якая асела пераважна ў Чэхаславакіі і Германіі.

У 1923 г. беларускае замежжа не з'яўлялася адзіным цэлым, а прадстаўляла шэраг звязаных паміж сабой палітычных груповак. Гэтыя групы не былі аднароднымі ні па складзе, ні па становішчы ўнутры краіны знаходжання, ні па ўплыве на падзеі. Фактычна яны групаваліся вакол трох цэнтраў. Найбольш шматлікай была групоўка ў Заходняй Беларусі, якая таксама распадалася на некалькі накірункаў пераважна па прынцыпе знешнепалітычнай арыентацыі і метадах палітычнай барацьбы. Нягледзячы на тое, што фактычна ўсе яны мелі агульную палітычную платформу, якая грунтавалася на непрызнанні Рыжскага мірнага дагавора і неабходнасці развіцця нацыянальнага жыцця беларусаў у ІІ Рэчы Паспалітай, меліся паміж імі і значныя адрозненні.

Першую групу складалі так званыя «прагматыкі» – Б. Тарашкевіч, А. Луцкевіч, С. Рак-Міхайлоўскі, А. Станкевіч, А Смоліч, Ф. Ярэміч і інш. – дзеячы, звязаныя раней з Найвышэйшай Радай. Яны былі прыхільнікамі парламентарызму, лічылі, што толькі ён вырашыць праблемы беларусаў, і стаялі ў апазіцыі да ўрада Ластоўскага.

Іншую пазіцыю ў адносінах да польскай дзяржавы займалі дзеячы, верныя эмігранцкаму ўраду БНР у Коўне. Яна была сфармуляраваная беларускімі эсэрамі і грунтавалася на рэзкім непрызнанні Рыжскага дагавора, імкненні разгарнуць партызанскі рух у Польшчы на выпадак яе канфлікту з Літвой. Але ў 1923 г. партызанскі рух быў ці часткова разгромлены Польшчай, ці ўзяты пад кантроль камуністамі. Увогуле ў 1923–1925 гг., дзякуючы карнай палітыцы польскіх улад, нелегальная дзейнасць была значна абмежавана.

Дзеячы створанай у 1923 г. КПЗБ, безумоўна, арыентаваліся на БССР і ўвогуле на СССР. Імі таксама быў узяты курс на ўзброенае паўстанне з мэтай далучэння Заходняй Беларусі да БССР. З гэтай нагоды яны імкнуліся падпарадкаваць сабе ўвесь беларускі рух увогуле і партызанскі рух у прыватнасці.

**Асноўная частка**. Пераломным годам у беларуска-польскіх дачыненнях можна лічыць 1924 г., які характарызаваўся найбольшай напружанасцю беларускіх выступленняў супраць польскіх улад. Але значных вынікаў гэтыя выступленні не прынеслі. Акрамя таго, у 1924 г. Камінтэрн пасля падаўлення Кракаўскага паўстання 1923 г. і спаду рэвалюцыйнага руху мяняе сваю палітыку ў дачыненні да Польшчы, згортвае нелегальную працу і засяроджваецца на легальнай рабоце.

У выніку ўсяго гэтага ў 1925 г. група Б. Тарашкевіча прыходзіць да высновы, што саюз з Польшчай – шкодная ілюзія. Дэпутаты Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ) адмаўляюцца ад супрацоўніцтва з уладамі Польшчы і бяруць курс на збліжэнне з КПЗБ. Б. Тарашкевіч нават прымаў удзел у ІІІ канферэнцыі КПЗБ, што адбылася ў 1926 г. у Маскве. Увогуле за два гады БСРГ становіцца самай шматлікай беларускай партыяй у Заходняй Беларусі, пакуль у 1927 г. яна не была разгромлена польскімі ўладамі.

Фактычна разгром БСРГ быў на руку КПЗБ, якая займае яе месца і становіцца самай уплывовай беларускай партыяй. На выбарах у сейм у 1928 г. за яе прагаласавала 26% выбаршчыкаў Заходняй Беларусі, што выводзіць яе на першае месца сярод іншых беларускіх партый [1, с. 186].

У лістападзе 1925 г., пасля выхаду групы Б. Тарашкевіча з Беларускага пасольскага клуба, Фабіян Ярэміч і Васіль Рагуля стварылі Беларускі сялянскі саюз, які павінен быў стаць альтэрнатывай левай грамадзе. У якасці праграмы-максімум яны выступалі за ўтварэнне незалежнай Беларусі, у якасці праграмы-мінімум – за ўтварэнне культурнай аўтаноміі для беларусаў у Польшчы.

Самай памяркоўнай сярод гэтых груп была Беларуская хрысціянская дэмакратыя на чале з А. Станкевічам, В. Гадлеўскім і Л. Хвецькам, якая базіравалася на хрысціянскіх каштоўнасцях і выказвала стрыманыя патрабаванні ў нацыянальным пытанні. Тым не менш і яна

наклікала на сябе гнеў польскай адміністрацыі і кіраўніцтва касцёла.

Трэба яшчэ прыгадаць групу А. Луцкевіча і Р. Астроўскага, якая фактычна перайшлі на праўрадавыя пазіцыі і заклікала засяродзіцца выключна на культурніцкай справе. Але яна не мела значнай падтрымкі ў грамадстве, і яе палітычны ўплыў з 1927 г. сышоў на нішто.

Калі характарызаваць асноўны вектар развіцця беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі ў перыяд з 1923 па 1927 гг., то ён будзе вызначацца радыкалізацыяй падзелу беларускіх партый на правае і левае крыло, змяншэннем уплыву першага і дрэйфам другога да ўсё большай прасавецкай арыентацыі. На наш погляд, гэта тлумачыцца наступнымі прычынамі: па-першае, урад БНР так і не здолеў прарвацца на міжнародную арэну як паўнавартасны суб’ект міжнароднага права, што паступова пазбаўляла яго прывабнасці ў якасці цэнтра беларускага нацыянальнага руху; па-другое, на фоне ўзмацнення рэпрэсій з боку польскіх улад і росту ў іх шавіністычных настрояў фактычна немагчымым было праводзіць узважаную палітычную лінію. Партыі павінны былі ці займаць праўрадавую пазіцыю і тым самым страчваць падтрымку сярод шырокіх мас насельніцтва, ці радыкалізавацца, што немінуча штурхала іх да саюза з камуністамі; па-трэцяе, беларускія партыі зноў апынуліся паміж «молатам і кавадлам» – між імкненнем кіраўніцтва Польшчы цалкам зліквідаваць любы беларускі рух і жаданнем савецкага кіраўніцтва поўнасцю гэты рух падпарадкаваць.

1923 г. з’явіўся пераломным і ў гісторыі БНР. 15 красавіка Савет паслоў Антанты прымае дадатковы пратакол да Версальскага дагавора, які замацаваў міжнароднае прызнанне межаў, усталяваных Рыжскім мірным дагаворам. Як ужо казалася вышэй, стабілізацыя палітычнага і эканамічнага становішча ва Ўсходняй Еўропе прывяла да таго, што беларускае пытанне пачынае разглядацца як нешта непатрэбнае ці нават небяспечнае.

З гэтай нагоды прадстаўнікі БНР і арыентаваныя на яе партыі паступова страчвалі падтрымку з боку ўрадаў іншых краін. Даўжэй за ўсіх яны атрымлівалі падтрымку з боку кіраўніцтва Літвы, але пасля канчатковага далучэння ў 1923 г. «Сярэдняй Літвы» да Польшчы і яно паступова губляе цікавасць да беларускага пытання [2, с. 269]. Увогуле палітыка літоўскага ўрада ў гэтым годзе рэзка пачынае мяняцца, сведчаннем чаго могуць быць наступныя радкі з ліста старшыні рады БНР П. Крачэўскага, напісанага 30 ліпеня 1923 г. прадстаўніку БНР у Чэхаславакіі: «Беларуская акцыя ў Літве лопнула. Свядома ці не свядома Літва адмовілася даць правы і адпаведную дапамогу жыхарству Віленшчыны, а тым самым і зляжыла з нас абавязкі падтрымліваць братнія суседскія адносіны ў стасунку да Літвінаў» [3, с. 1420]. У выніку гэтага 1 лістапада 1923 г. Прэзідыум Рады і ўрад БНР былі вымушаны пакінуць Літву і пераехаць у Чэхаславакію. З гэтага часу цэнтрам беларускай палітычнай эміграцыі становіцца Прага.

Увогуле ўзгаданы ліст утрымлівае ў сабе каштоўныя звесткі аб змене курса кіраўніцтва БНР. Так, характарызуючы змены, якія адбыліся, П. Крачэўскі піша: «Мы былі і будзем аб’ектам гандлю ўжо не паміж Літвой і Польшчай, а паміж Польшчай і Савецкай Беларусьсю, што надае нам больш годную пазіцыю і ў палітычным, і ў нацыянальным сэнсе... Цяпер мы павінны трымацца самі і весьці барацьбу за сваю незалежнасць і непадзельнасць уласнымі сіламі» [3, с. 1421]. Акрамя таго, ім даецца рэзка адмоўная характарыстыка дзейнасці В. Ластоўскага, якога ён фактычна абвінавачвае ў здрадзе.

У жніўні 1923 г. быў сфарміраваны новы ўрад БНР на чале з А. Цвікевічам, але адхіленне В. Ластоўскага выклікала толькі новы разлад, паколькі ЦК БПС-Р выказаўся супраць прызначэння Цвікевіча. Прэзідыум Рады БНР раскалоўся на дзве часткі, між тым Цвікевіч застаўся выконваючым абавязкі Старшыні Рады Міністраў.

Сітуацыю ўскладняў і раскол у нацыянал-дэмакратычным руху. Першапачатковая розніца ў поглядах па праблеме знешнепалітычнай арыентацыі вылілася ў адкрытае супрацьстаянне з яўнымі спробамі дыскрэдытацыі палітычных апанентаў.

Акрамя гэтага, разгром партызанскага руху і ўнутраны раскол БПС-Р (з яе выйшла Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя) прыводзіць да паступовага заняпаду гэтай партыі, і ў чэрвені 1924 г. пад ціскам КП(б)Б на з’ездзе былых членаў БПС-Р прымаецца рашэнне аб яе самароспуску. Гэта не магло не адбіцца на пазіцыях БНР, паколькі менавіта БПС-Р з’яўлялася яе галоўнай апорай.

Усе вышэй пералічанае прывяло да таго, што значную частку прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху апанавалі песімістычныя настроі. Змаганне на два франты падаецца ім бесперспектыўнай справай, вырашэнне беларускага пытання ў Польшчы – марнай ілюзіяй. Гэта прымушае іх усё болей схіляцца ў бок падтрымкі БССР як галоўнага аб’яднаўчага цэнтра ўсіх беларускіх сіл, што, дарэчы, мела свае падставы. На той момант фактычна толькі БССР уяўляла з сябе вядомую форму беларускай дзяржаўнасці. Акрамя таго, новая эканамічная палітыка, беларусізацыя, узбуйненне тэрыторыі і ўмелая прапаганда дасягненняў у БССР парадзілі ў часткі беларускіх дзеячаў пэўныя спадзяванні.

Адлюстраваннем дадзенага працэсу з’яўляецца ліст А. Цвікевіча ў Беларускі Краёвы

Цэнтр у Вільні ад 4 лютага 1925 г., дзе ён піша: «...нашае пытанне чым далей тым больш набірае, з пункту гледжання ўсіх зафіксаваўшых сябе нацый – небяспечнага характару. Толькі той, хто разлічвае на міжнародныя непарадкі, каб выправіць свае недахваты, толькі таму мы цікавы рэальна, як сіла дэструктыўная. З гэтага боку мы цікавы немцам, саветчыкам і ліцвінам (віленская болька). Чэхі і ўсе іншыя цікавяцца нашай справай як элементам усходняй праблемы». Далей ён характарызуе адносіны да Савецкай Беларусі «...аб становішчы ў Менску... Разам з Вамі чакаю моманту, калі жа ўрэшце беларускі Менск зробіцца сапраўды беларускім... Усё роўна – “наша пераможа”. Наколькі пры гэтым наша ідэя ў яе практычным прылажэнні мадыфікуецца – пытанне не такое ўжо пякучае. Працэс зыходжання Менску з маскоўскіх рэяк гаворыць за тое, што наша мадыфікацыя навогул можа быць вельмі і вельмі нязначная. У кожным разе – дзе б я ні быў – я буду перакананы, што праўда беларуская на нашым, а не іхным баку» [4, арк. 17–18].

З аналізу дадзенага ліста вынікаюць дзве галоўныя высновы. Па-першае, у часткі беларускай палітычнай эміграцыі страчваюцца перспектывы далейшай палітычнай дзейнасці; па-другое, не зусім правільнае разуменне таго, што адбываецца ў БССР, штурхае іх да саюза з прадстаўнікамі апошняй.

На наш погляд, прычынай з’яўлення падобных настрояў былі не толькі тыя цяжкасці, з якімі ў той час сутыкнулася кіраўніцтва БНР, але і дастаткова разумная палітыка ўрада Савецкай Беларусі ў дачыненні да беларускай эміграцыі. Безумоўна, яго не магло не раздражняць існаванне «урада ў выгнанні», тым больш што апошні не сядзеў склаўшы рукі, яго прадстаўнікі звярталіся ва ўсе магчымыя арганізацыі з мэтай прыцягнення ўвагі да Беларусі. Кіраўніцтва БССР не пайшло на адкрытую канфрантацыю, а завязала дыпламатычную гульню, канчатковай мэтай якой было прызнанне БССР адзіным беларускім цэнтрам. Праца вялася па некалькіх накірунках: стварэнне «ўзорнай рэспублікі» з мэтай прапаганды савецкага ладу жыцця; абвяшчэнне палітычнай амністыі тым праціўнікам савецкай улады, якія не выступалі супраць яе са зброяй у руках, і прапанова вяртання на радзіму; фінансавая дапамога лаяльнай частцы эміграцыі.

У 1925 г. кіраўніцтвам БССР фактычна быў распрацаваны план, скіраваны на ліквідацыю БНР. Распачало гэты працэс пасяджэнне бюро ЦК КП(б)Б, якое адбылося 6 студзеня 1925 г., дзе было прызнана мэтазгодным ліквідаваць «беларускі народны ўрад», аднак такім чынам, каб гэта суправаджалася дэкларацыяй дадзенага ўрада на карысць Савецкай Беларусі [5, арк. 6]. Дакладней кажучы, такая ініцыятыва зыходзіла з Масквы, паколькі дакладваў па гэтым пытанню М. Ітві, які з’яўляўся ўпаўнаважаным наркамата замежных спраў СССР пры ўрадзе БССР, а ў маі абмяркоўвалася пасылка прадстаўнікоў БССР на нараду ў Маскву пры НКЗС па беларускім пытанні.

Галоўным каардынатарам дадзенага мерапрыемства быў прызначаны А. Ульянаў, на якога ўскладаліся ўсе перамовы з групай А. Цвікевіча. Для магчымасці фінансавання легальнай працы за мяжой 31 ліпеня 1925 г. прымаецца пастанова аб арганізацыі ў Вільні кааператыўнага банка [5, арк. 253]. Далей, 14 жніўня, на закрытым пасяджэнні сакратарыята ЦК КП(б)Б прымаецца пастанова аб мэтазгоднасці склікання II Усебеларускай палітычнай канферэнцыі ў Берліне. На гэтым пасяджэнні прымаюцца 7 абавязковых умоў да групы А. Цвікевіча. Галоўныя з іх: папярэдняе прызнанне Мінска як адзінага культурнага і палітычнага цэнтра; адмова ад арыентацыі на Лігу Нацый; прызнанне немэтазгодным стварэнне новага цэнтра беларускага руху за мяжой, у крайнім выпадку згода на стварэнне цэнтра на тэрыторыі БССР з савецкай арыентацыяй; згода на супрацоўніцтва з БСРГ пры польскім сейме. Пры прыняцці гэтых умоў давалася згода на фінансаванне групы А. Цвікевіча. Паколькі перамовы прайшлі паспяхова, то праз 10 дзён прымаецца рашэнне аб пераводзе праз А. Ульянава 3000 рублёў і ўключэнні дадатковага пункта аб неабходнасці прыцягнення на канферэнцыю як мага болей «саветафільскіх элементаў» [6, арк. 6].

Але на практыцы адбывалася не ўсё так гладка. Спачатку бальшавікі апасаліся супрацьдзеяння канферэнцыі групы Ластоўскага, потым узнікла непаразуменне з самім А. Цвікевічам. Наколькі магчыма прасачыць па дакументах, А. Цвікевіч, згаджаючыся перадаць паўнамоцтвы ўрада БНР ураду БССР, збіраўся пакінуць замест урада нейкі новаўтвораны «Беларускі камітэт», на які меркавалася ўскласці каардынацыю дзеянняў беларускага руху за мяжой. Гэта выклікала рэзкую незадаволенасць кіраўніцтва БССР, што знайшло сваё адлюстраванне ў пастанове нарады па замежных справах пры ЦК КП(б)Б аб берлінскай канферэнцыі ад 13 верасня 1925 г. У ёй, у прыватнасці, адзначалася: «1. Беларускі камітэт, будзь ён падабраны на Берлінскай канферэнцыі, нават пры ўмове складання паўнамоцтваў БНР, акажацца сілай супраць СССР, будзе жывіць ілюзіі ў беларускім пытанні, аслабляючыя пазіцыю СССР; яго ўтварэнне будзе разглядацца як выступленне супраць БССР. 2. Паставіць перад групай Ц. (Цвікевіча) катэгарычнае пытанне: ці прыняць зараз усе ўмовы БССР, ці БССР адмаўляецца ў далейшым ад якіх бы то ні было перамоў з групай Ц. і пачынае супраць яе барацьбу» [6, арк. 8].

Як бачна, дадзеная пастанова па стылі нагадвае ультыматум, што можа сведчыць аб

супраціўленні Цвікевіча, з аднаго боку, і намеры максімальна выкарыстаць яго жаданне пераехаць у БССР, з другога. Складанасць абстаноўкі выявілася яшчэ і ў тым, што падрыхтоўка да дадзенай канферэнцыі вялася патаемна ад старшыні Рады БНР П. Крачэўскага, які адмаўляў ідэю любых перамоў, калі яны не вяліся зыходзячы з прынцыпу «незалежнасці і непадзельнасці» Беларусі. Гэтая канферэнцыя, на думку кіраўніцтва БССР, павінна была прайсці цалкам у рэчышчы прасавецкіх настрояў, і таму было прызнана непажаданым хоць якое-небудзь выступленне супраць Мінска. Таму 6 кастрычніка прымаецца рашэнне «прызнаць удзел у канферэнцыі С.Р. (сацыялістаў-рэвалюцыянераў) шкодным» [5, арк. 401].

Вось на такіх умовах 15 кастрычніка 1925 г. адбываецца II Усебеларуская канферэнцыя ў Берліне, на якой прысутнічалі 17 дэлегатаў. Дадзеная канферэнцыя прыняла пастанову Рады Народных Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі, у якой казалася: «У свядомасці таго, [што] улада сялян і работнікаў, замацаваная ў Менску – сталіцы Радавай Беларусі, запраўдна імкнецца адрадзіць Беларускі народ культурна, эканамічна і дзяржаўна, што Радавая Беларусь ёсьць адзіная рэальная сіла, якая можа вызваліць Заходнюю Беларусь ад польскага іга, у поўным паразуменьню з краявымі арганізацыямі, ПАСТАНАВІЛІ: спыніць існаваньне Ўраду Беларускай Народнай Рэспублікі і прызнаць Менск адзіным цэнтрам нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння Беларусі» [3, с.1632].

Як мы бачым, у гэтым невялічкім дакуменце двойчы ўзгадваецца дзяржаўнасць Беларусі, што дае нам падставы сцвярджаць: дадзены крок не простая капітуляцыя групы Цвікевіча ў адносінах да Савецкай Беларусі, а своеасаблівае бачанне далейшых перспектываў развіцця беларускай дзяржаўнасці. Акрамя таго, канферэнцыя прыняла некалькі рэзалюцый, у прыватнасці, рэзалюцыю аб палітычным становішчы, дзе ішла гаворка аб пажаданасці далучэння да рэспублікі Гомеля і іншых усходніх паветаў, але пры друкаванні ў савецкай прэсе гэтая фраза была апушчана.

Дадзеную канферэнцыю можна лічыць працягам расколу, які назіраўся ў беларускім эмігранцкім руху ў той перыяд. Як бачна, гэты раскол быў вынікам не толькі ўнутраных супярэчнасцяў, але і знешніх абставін.

Фармальна прадстаўнікі Савецкай Беларусі дабіліся свайго, але на самой справе ўсё было не так гладка, паколькі Прэзідыум Рады БНР рашэнні канферэнцыі не прызнаў. Па-першае, гэта супярэчыла ранейшым пастановам Рады, паводле якіх урад не мог прымаць самастойныя рашэнні, а таксама збірацца паасобна ад Прэзідыума Рады БНР. Па-другое, Цвікевіч быў толькі выконваючым абавязкі Старшыні Рады Міністраў. Больш таго, напярэдадні канферэнцыі яе ўдзельнікі склалі з сябе афіцыйныя абавязкі і прымалі ў ёй удзел як прыватныя асобы.

**Заключэнне.** Такім чынам, цалкам ліквідаваць структуры БНР не атрымалася. Але пасля 1925 г. усё болей і болей прадстаўнікоў эміграцыі перабіраецца ў Беларусь ці паступова адыходзяць ад палітычнай дзейнасці. Фактычна толькі невялікая група беларускай палітычнай эміграцыі, што гуртавалася вакол Старшыні Рады БНР П. Крачэўскага, засталася вернай Беларускай Народнай Рэспубліцы і так і не прызнала Савецкую Беларусь.

## Літаратура

1. Кобяк, С. В. Акт исторической справедливости (из истории борьбы КПЗБ за социальное и национальное освобождение трудящихся Западной Беларуси) / С. В. Кобяк, А. Н. Мацко // Страницы истории Компартии Белоруссии: суждения, аргументы, факты. – Минск, Университетское, 1990. – 446 с.

2. Коўкель, І. Польска-літоўскі канфлікт і роля ў ім беларускіх палітычных партыяў і арганізацыяў (1920–1923 гг.) / І. Коўкель // Беларусіка=Albaruthenica. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – Кн. 3. – 382 с.

3. Архівы БНР. Т. 1. – Вільня; Нью-Йорк; Менск; Прага, 1998. – 1721 с.

4. НАРБ. – Фонд 325. – Воп. 1. – Спр. 9 .

5. НАРБ. – Фонд 4. – Воп. 3. – Спр. 6.

6. НАРБ. – Фонд 4. – Воп. 21. – Спр. 46.